*УДК 37.091.33-028.22:004.9:811.161.3:821.161.3*
***Н. Ф. Васіленка, З. У. Шведава***
*г. Гомель, ДУА “Гімназія № 10 г. Гомеля”, г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# «ВОБЛАКА СЛОЎ» ЯК СПОСАБ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Сучасная інфармацыйная прастора знаходзіцца ў пастаяннай дынаміцы і характарызуецца бесперапынным павелічэннем аб’ёму дадзеных, якія спажываюцца грамадствам. У сувязі з развіццём інфармацыйных тэхналогій сучасны настаўнік павінен хутка арыентавацца ў інфармацыі, аналізаваць і эфектыўна выкарыстоўваць яе ў прафесійнай дзейнасці.

За апошнія гады ў сферы электроннай лінгвадыдактыкі назапашаны багаты вопыт у спосабах афармлення, арганізацыі і прэзентацыі вучэбнага матэрыялу ў лічбавым асяроддзі, які ў існуючых абставінах паслужыў фундаментам для пошуку новых сродкаў эфектыўнага бесперапыннага навучання ў дыстанцыйных умовах і аб’ектам міждысцыплінарнага даследавання метадыстаў, філолагаў, праграмістаў і псіхолагаў. Сёння настаўнікі апынуліся ва ўмовах неабходнасці хуткага ўкаранення ва ўласную практыку існуючых дасягненняў электроннай лінгвадыдактыкі, з аднаго боку, і пошуку новых інструментаў і магчымасцяў стварэння якаснага навучання ў звычнай і асабліва дыстанцыйнай форме, з другога боку.

Адной з эфектыўных тэхналогій актывізацыі навучання з’яўляецца метад візуалізацыі навучальнай інфармацыі, які атрымаў шырокае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе. Прымяненне візуальных форм засваення вучэбнай інфармацыі дазваляе змяніць і ўдасканаліць характар навучання: паскорыць успрыманне, асэнсаванне і абагульненне, выпрацоўваць уменне аналізаваць паняцці, згортваць і разгортваць інфармацыю.

Задачы візуалізацыі шматлікія і разнастайныя: прадставіць і структураваць асноўны навучальны матэрыял; дапоўніць асноўны матэрыял; забяспечыць лагічнасць у выкладанні інфармацыі; прадэманстраваць узаемасувязь паміж тэкстам і графічнымі выявамі, якія спрыяюць актыўнаму ўспрыманню навучальнага матэрыялу.

У чым перавага візуалізацыі інфармацыі? На гэтае пытанне можна адказаць наступным:

– дапамагае вучням правільна арганізаваць і прааналізаваць інфармацыю: дыяграмы, схемы, малюнкі, карты памяці садзейнічаюць засваенню вялікіх аб’ёмаў інфармацыі, дазваляюць лёгка заапамінаць і адсочваць узаемасувязі паміж блокамі інфармацыі;

– дае магчымасць уключыць атрыманую інфармацыю ў цэласную карціну пра аб’ект ці з’яву;

– хутка ахапіць вялікі аб’ём інфармацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

– перадаць і рэканструяваць розныя падзеі і працэсы;

– выкласці вучэбны матэрыял у цікавай запамінальнай форме.

Існуе вялікая колькасць традыцыйных спосабаў візуалізацыі ўрока, яго часткі. У межах прапанаванага артыкула спынім увагу на адным са спосабаў візуалізацыі, які атрымаў метафарычнае найменне “воблаку слоў” і актыўна выкарыстоўваецца ў практыцы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ДУА “Гімназія № 10 г. Гомеля”, філіяла кафедры беларускай мовы.

*Воблака слоў (воблака тэгаў)* – гэта візуальнае прадстаўленне спісу ключавых слоў ці паняццяў [1]. Раней “воблака слоў” выкарыстоўвалася толькі на сайтах па прынцыпу гіперспасылак. У апошні час прымяненне дадзенага спосабу візуалізацыі змянілася. Па-першае, словамі, з якіх фарміруецца воблака, зараз могуць быць не толькі гіперспасылкі: любы тэкст з дапамогай спецыяльных праграмных сродкаў, напрыклад, Tagxedo.com, Tagul.com, Wordle.net, можна пераўтварыць у воблака слоў. Па-другое, воблака слоў актыўна стала выкарыстоўвацца ў сферы адукацыі.

Прывядзём некалькі розных ілюстрацый з каментарыямі магчымасці выкарыстання настаўнікам беларускай мовы і літаратуры названага спосабу візуалізацыі на ўроку.

Так, воблака слоў можа быць выкарыстана ў якасці дыдактычнага матэрыялу на любым уроку беларускай мовы ці літаратуры і на розных яго этапах. Гэта могуць быць, напрыклад, заданні “Узнаві прыказку (фразеалагізм, цытату)” па дадзеных словах з прыказкі (фразеалагізма, цытаты), якія трэба сабраць; “Збяры верш”, калі дадзены словы з невялікага па памеры верша, па якіх вучні павінны ўзнавіць поўны тэкст. Воблака слоў можа быць скарыстана на ўроках мовы пры вывучэнні, напрыклад, сінонімаў, для чаго можна прапанаваць знайсці пару сінанімічных слоў з прапанаваных у воблаку слоў:




Воблака слоў можа выкарыстоўвацца на ўроках літаратуры для прадстаўлення інфармацыі пра аўтара ці героя яго твора, для акцэнтавання ўвагі на важных датах, падзеях і інш. Напрыклад, заданне «Угадай аўтара і назву твора», для чаго ў воблака могуць быць уключаны словы, якія называюць герояў твора, месца і іншыя прыкметы, што

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

дазволяць вызначыць твор. Ці, напрыклад, воблака рыс літаратурнага героя; ідэя твора ў выглядзе воблака і інш.

Воблака слоў можа выкарыстоўвацца на ўроках як мовы так і літаратуры для акцэнтавання ўвагі на ключавых словах. Напрыклад, на ўроках мовы можна выкарыстоўваць заданні тыпу “Слоўнікавыя словы” – воблака са слоўнікавых слоў у межах аднаго правіла, адной тэмы і г.д., ці воблака лінгвістычных тэрмінаў пэўнага раздзела і інш. На ўроках літаратуры па воблаку ключавых слоў пэўнага верша назваць аўтара, назву і інш.

Яшчэ воблака слоў можа выкарыстоўвацца на ўроках як мовы, так і літаратуры для прадстаўлення вынікаў апытвання ці абмеркавання. Напрыклад, прапануем заданні “Скласці воблака асацыяцый да верша Р. Барадуліна “Трэба дома бываць часцей…”:




Ці да верша М. Танка “Шчасце”:




Такі спосаб уключэння вучняў у работу можа выкарыстоўвацца для стварэння яркіх, запамінальных прадуктаў (афішы, буклеты і інш.) пры падрыхтоўцы да розных пазакласных мерапрыемстваў па прадмеце.

Такім чынам, воблака слоў як спосаб візуалізацыі вучэбнага матэрыялу можна выкарыстоўваць на любым і кожным уроку як беларускай мовы, так і літаратуры, пачынаючы з паведамлення тэмы і пастаноўкі мэты ўрока як сродку павышэння матывацыі і цікавасці і заканчываючы этапам рэфлексіі для вызначэння адносін і месца вучняў на пэўным уроку. Гэта можа быць скарыстана ў якасці дыдактычнага матэрыялу з рознымі мэтамі, для прадстаўлення новай інфармацыі, для акцэнтавання ўвагі на ключавых словах, для прадстаўлення вынікаў апытвання ці абмеркавання, для стварэння яркіх, запамінальных вобразаў і інш. Дадзены спосаб візуалізацыі забяспечвае актывізацыю вучэбнай і пазнавальнай дзейнасці, фарміраванне і развіццё крытычнага і візуаль-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

нага мыслення, зрокавага ўспрымання, вобразнага прадстаўлення ведаў, стымулюе крэатыўны падыход да вучэбнай дзейнасці.

**Літаратура**

1. Шумак, Е. Г. Двадцать способов использования «облака слов» на уроках русского языка и литературы / Е. Г. Шумак // Русский язык и литература. – 2017. – № 7. – С. 27-28.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ